размешчана некалькі птушкафабрык. Найбуйнейшыя знаходзяцца каля Баранавічаў, Дзяржынска, Мінска (мал. 94).

**6. Конегадоўля.** У краіне налічваецца 20 тыс. коней. Аснова падгаліны — племянны кірунак. Распаўсюджваецца выкарыстанне коней для верхавой язды.

**7. Зверагадоўля** — адна з самых маладых падгалін жывёлагадоўлі. Займаецца развядзеннем каштоўных пушных звяроў (норка, пясец, ліса, нутрыя, трус і інш.) на зверафермах. Найбольшыя зверагаспадаркі размяшчаюцца каля Маладзечна, Баранавічаў, Пінска, Вілейкі, Гродна.

**8. Пчалярства** развіваецца на пчолапрадпрыемствах, у фермерскіх гаспадарках і ў значнай колькасці — у пчаляроў-аматараў. Найбольшыя пчолапрадпрыемствы знаходзяцца каля Мастоў і Шчучына ў Гродзенскай вобласці. Пчалярства ў Беларусі мае апыляльна-мядовы кірунак.

**Падвядзём вынікі.** У Беларусі развітая жывёлагадоўля малочнага і малочна-мяснога кірунку. На долю свініны прыпадае больш за 40 % вытворчасці мясной прадукцыі. Буйныя птушкафабрыкі прамысловага тыпу ёсць ва ўсіх абласцях краіны.

***Праверце сябе.*** 1. Які фактар з'яўляецца вызначальным у выбары спецыялізацыі і размяшчэнні асобных падгалін жывёлагадоўлі? 2. Назавіце вядучую падгаліну жывёлагадоўлі ў Беларусі. У чым асаблівасці яе развіцця? 3. Які фактар вядучы ў размяшчэнні птушкафабрык у краіне?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму ў вытворчасці мясной прадукцыі значная доля прыпадае на свініну? 2. Чаму птушкагадоўля — адна з падгалін, якая развіваецца найбольш дынамічна? 3. З якой мэтай у краіне развіваецца зверагадоўля?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Па картах атласа (с. 39, 46–47) вызначце спецыялізацыю жывёлагадоўлі рэгіёна, у якім вы жывяце.

## § 29. Геаграфія лясной і рыбнай гаспадаркі

***Успомніце.*** *Якія тыпы лясоў характэрныя для Беларусі? Якая лясістасць у Беларусі?*

**1. Структура і роля лясной гаспадаркі ў эканоміцы краіны.** Лясная гаспадарка мае важнае значэнне для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і забеспячэння яе эканамічнай, энергетычнай,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

экалагічнай і харчовай бяспекі. Лясная гаспадарка ўключае лесаводства, лесанарыхтоўкі, збор дзікарослых і нядрэвавых лесапрадуктаў.

По шэрагу ключавых паказчыкаў (лясістасць тэрыторыі, плошча лясоў, запас драўніны на аднаго жыхара) Беларусь уваходзіць у першую дзясятку лясных дзяржаў Еўропы.

Лесаводства займаецца вырошчваннем лесу. У 2010–2023 гг. лесаразвядзенне мела тэндэнцыю да павелічэння і штогод адбывалася на плошчы больш за 35 тыс. га. Найбольш высокія паказчыкі лесаразвядзення ў Гомельскай вобласці. Цяпер запасы драўніны складаюць 1,8 млрд м$^3$. Гэта больш, чым у большасці краін Еўропы. Самыя буйныя запасы драўніны адзначаны на тэрыторыі Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцей, найменшыя — у Брэсцкай і Гродзенскай.

З кожным годам паляпшаюцца якасныя паказчыкі лясоў. Запас складае 210 м$^3$/га, сярэдні ўзрост дрэў павялічыўся з 50 да 54 гадоў. Адбываецца паступовае выраўноўванне ўзроставай структуры лясоў, прычым доля спелых дрэвастояў складае 17,2 %. Прааналізуйце дыяграму «Узроставая структура лясоў» на с. 49 атласа і вызначце, ці будзе павялічвацца доля спелых лясоў.

Лесанарыхтоўкі займаюць першае месца ў лясной гаспадарцы па аб'ёме вытворчасці і колькасці працаўнікоў. Асаблівасцю структуры сыравінных запасаў драўніны ў Беларусі з'яўляецца перавага прамыслова-каштоўных парод. Асноўная доля насаджэнняў прыпадае на хваёвыя пароды (хвоя і елка), затым ідуць мяккалістыя пароды — бяроза, асіна.

Нарыхтоўкі драўніны вядуцца ў буйных лясных масівах лягасамі і лесапрамгасамі (мал. 95). Профільныя прадпрыемствы ёсць ва ўсіх абласцях. Больш за ўсё іх у Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях, якія даюць амаль 3/4 усёй драўніны. Менш прадпрыемстваў у Гродзенскай вобласці, але і тут, у басейне Нёмана, ёсць даволі буйныя масівы лясоў і, адпаведна, вялікія аб'ёмы лесанарыхтовак. Больш за 50 % лесанарыхтовак ажыццяўляецца механізаваным спосабам. Асноўным



Мал. 95. У час лесанарыхтоўкі

прадпрыемствам у краіне па нарыхтоўцы драўніны з'яўляецца канцэрн «Беллеспаперапрам». Лесанарыхтоўка драўніны ў цяперашні час штогод павялічваецца і складае крыху больш за 24 млн м$^3$ драўніны.

Збор дзікарослых і нядрэвавых лесапрадуктаў ажыццяўляецца для прамысловых, лячэбных, аздараўленчых і іншых мэт. Да дзікарослых і нядрэвавых лесапрадуктаў адносяцца грыбы, ягады і арэхі, бярозавы сок, дзікарослыя расліны, мох, лясны подсціл, апалае лісце, насенне дрэў і хмызнякоў.

У Беларусі біялагічныя рэсурсы ягад і пладоў складаюць да 50 тыс. т, ядомых грыбоў — каля 60 тыс. т, лекавай сыравіны — прыкладна 90 тыс. т, бярозавага соку — каля 480 тыс. т.

**2. Геаграфія паляўнічых угоддзяў краіны.** Доўгі час паляванне на дзікага звера і птушку было асноўнай крыніцай існавання людзей. З гэтай прычыны колькасць жывёл паслядоўна скарачалася. Сёння вядзенне паляўнічай гаспадаркі ў Беларусі — кірунак дзейнасці, які перспектыўна развіваецца і дазваляе ажыццяўляць кантроль за аховай і выкарыстаннем дзікіх жывёл, якія адносяцца да аб'ектаў палявання.

Якія жывёлы былі знішчаны на тэрыторыі Беларусі?

Якія віды жывёл адносяцца да рэсурсных і маюць прамысловае значэнне?

Плошча паляўнічых угоддзяў краіны складае каля 17 млн га: лясных паляўнічых угоддзяў — 46 %, палявых — 48 %, водна-балотных — 6 %. Практычна ў кожным раёне ёсць паляўнічыя гаспадаркі. Для рэгулявання колькасці прамысловых відаў жывёл вызначаюцца аптымальныя тэрміны палявання, арганізаваны падкорм дзікіх жывёл у зімовы час. Развіваецца замежны паляўнічы турызм.

**3. Геаграфія рыбалоўства і рыбаводства.** У рыбнай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 600 прыродных (азёры, рэкі) і штучных (вадасховішчы і сажалкі) вадацёкаў і вадаёмаў. У азёрах жыве каля 30 відаў прамысловых рыб, але аснову промыслу складаюць лешч, судак, плотка, шчупак, акунь, сазан, сярэбраны карась, лінь. Найбольш буйныя рыбапрадуктыўныя азёры — Нарач, група Браслаўскіх і Ушацкіх азёр.

Назавіце найбуйнейшыя азёры краіны.

Пераважна на базе вадасховішчаў і азёр рыбалоўствам і развядзеннем рыб займаюцца рыбгасы, рыбагадавальнікі; створаны рыбныя сажалкі шэрага сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і дапаможных гаспадарак прамысловых прадпрыемстваў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рыбгасы размешчаны ў асноўным у Брэсцкай і Мінскай абласцях, рыбагадавальнікі — у Віцебскай. Тут разводзяць карпа, карася, таўсталобіка, белага амура, сома, фарэль, сцерлядзь. Акрамя спецыялізаваных рыбгасаў рыбаводствам займаюцца фермеры і індывідуальныя прадпрымальнікі.

Па карце атласа (с. 49) вызначце, дзе размешчаны рыбагаспадарчыя прадпрыемствы па вырошчванні карпа, амура, карася, таўсталобіка, фарэлі і асятровых.

**Падвядзём вынікі.** Галоўным прадпрыемствам у Беларусі па нарыхтоўцы драўніны з'яўляецца канцэрн «Беллеспаперапрам». Паляўнічыя гаспадаркі ёсць практычна ў кожным адміністрацыйным раёне. У рыбнай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 600 вадаёмаў і вадацёкаў краіны.

***Праверце сябе.*** 1. Якая структура лясной гаспадаркі? 2. У чым асаблівасці лесанарыхтовак у краіне? 3. Назавіце віды прамысловых рыб, якія жывуць ў азёрах і якіх разводзяць у рыбгасах і рыбагадавальніках.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якая роля лясной гаспадаркі ў забеспячэнні эканамічнай, энергетычнай, экалагічнай і харчовай бяспекі Беларусі? 2. Якая роля паляўнічых гаспадарак у захаванні жывёльнага свету?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Уявіце сябе карыстальнікам паляўнічых угоддзяў. Якія ўмовы вядзення паляўнічай гаспадаркі неабходна ўлічваць? Што вы зробіце, каб развіваць паляўнічы турызм?

## § 30. Геаграфія прамысловасці. Горназдабыўная прамысловасць

***Успомніце.*** *На якія віды падзяляюцца карысныя выкапні па ўмовах іх выкарыстання? Якія спосабы здабычы карысных выкапняў вы ведаеце?*

**1. Прамысловасць.** На долю прамысловасці ў Беларусі прыпадае 25 % ВУП (2023 г.), у ёй занята 24 % у спісачнай колькасці занятых у эканоміцы. У структуры аб'ёму прамысловай вытворчасці доля горназдабыўной прамысловасці — 1,5 %, апрацоўчай прамысловасці — 89,6 % (2024 г.). У цяперашні час у Беларусі налічваецца звыш 16 тыс. прамысловых арганізацый. Па аб'ёме прамысловай вытворчасці вылучаюцца Мінская, Гомельская вобласці і г. Мінск.

Успомніце, якія яшчэ вытворчасці вылучаюцца ў структуры прамысловасці.

Вядучая роля ў прамысловасці належыць апрацоўчым вытворчасцям. У галіновай структуры назіраецца высокая ўдзельная вага машынабудавання, хімічнай, нафтаперапрацоўчай і харчовай прамысловасці.